
Чырвоная
Беларусь, 1931,
№ 8.



ЫРВОНАЯ БЕЛАРУСЬ

1931

КРАСАВІК

8





ТАМ, ДЗЕ НАРАДЗІЎСЯ ЛЕНІН

Нарыс В. АРСКАГА

23 красавіка 1870 году ў сям'і народнага інспэктара народных вучылішчаў гор. Сімбірску ў Ільлі Мікалаевіча Ульянава нарадзіўся сын Уладзімер Ільліч.

Ульянаў пераехаў у Сімбірск з Ніжняга-Ноўгараду з невялікім сямействам: з ім прыехалі жонка і дзеці: Анна і Аляксандр.

Тут Ульянаў, з першых дзён сваёй новай пэдагогічнай дзейнасьці, сустрэўся з цэлым шэрагам перашкод.

Сімбірскае глыбока рэакцыйнае магнацтва вельмі мала зьвяртала ўвагі на становішча народнае асьветы, у асаблівасьці на вясковыя школы. Ня было матэрыяльных мажлівасьцяй, ня было пэдагогаў, ды і школы амаль што ня было. Усё гэта трэба было тварыць нанова. За гэтую справу і ўзяўся Ільля Ульянаў з першага дню, як пачаў ён выконваць абавязкі інспэктара. У выніку ўпартай работы Ільлі Мікалаевіча справа хутка рушылася ўперад, і ў павеце пачалі зьяўляцца першыя школы.

Вельмі характарны самы горад, у якім нарадзіўся Уладзімер Ільліч, будучы Ленін. Да канца дзевятнаццатага стагодзьдзя Сімбірск быў закінутым горадам. Прамысловасьць губэрні складалася выключна з некалькіх тэкстыльных фабрык. Мінулае Сімбірску, заселенага амаль выключна чыноўнікамі, магнацтвам і гандлярамі—беспраглядны малюнак агульнага сну і чыноўніцкага свавольства. Вельмі маляўніча паказаны быў Сімбірск таго часу ва ўспамінах расейскага пісьменьніка І. А. Гончарова. Вось што піша ён:

...Пасьля прыезду да дому, да сканчэньня ўнівэрсытэцкага курсу, мяне ашпарыла тэй самай „абломаўшчынай", якую я назіраў у дзяцінстве.

...Так і хочацца заснуць самому, гледзячы на гэтую цішу, на санлівыя вокны з апушчанымі фіранкамі, на санлівыя твары асоб, якія сядзяць па хатах, або сустракаюцца на вуліцах.

„Нам няма чаго рабіць",—пазяхаючы думае, здаецца, кожны з гэтых асоб, паглядаючы ляніва на вас:—мы не сьпяшаемся, жывём—хлеб жуём, ды неба чадзім".

„І сапраўды павінна так быць. Чыноўнік, дарайца якой небудзь палаты, гультаявата, а другой гадзіне, едзе з прысутствія да-хаты, ня трэба пры гэтым і дадаваць, што ад палаты да хаты ня было і двух крокаў. Пройдзе пісар, або гарнізонны салдат, ледзь-ледзь блукаючы па масту. Гандляры прытуліўшыся ў глыбіні крамы ў халадку, дзяды водзяць або ў шашкі гуляюць. Хлапчукі разьмяшчаюцца сярод вуліцы ў бабкі гуляць. Ля паркану каза траву скубе".

Ды і сапраўды глуш і сон—вось Сімбірск та-о часу.

Такі быў агульны стан Сімбірску, а жывыя хвігуры былі яшчэ больш выродлівыя.

Адных абшарнікаў у губэрні было больш за 1500, і большасьць іх узімку і ўлетку жылі ў Сімбірску. Што рабілі гэтыя людзі Сімбірскіх садоў—і гаварыць ня варта: балы, бязупынная п'янка і карцёжная гульня дзень у дзень, месяц у месяц.

Праўда, час ад часу, чыноўнікі справамі займаліся.

Вось, прыклад, вузор гэткае працы. Ганчароў піша:

„...Уздумалася губэрнатару аб'ехаць губэрніі і паслаў ён Якава ўперад, у тыя гарады, дзе ён хацеў сам пабыць і агледзець. Гэта рабілася для таго, каб у паветах усё ўпарадкавалі, справілі, што трэба, адным словам,—каб прачнулася начальства, і ўзяліся за справы...

...Вось і паехаў,—апавядае Якаў,—прыехаў у К., спыніўся ў гараднічага, кватэра ўжо гатова была. Ён пачаставаў мяне добрым сьнеданьнем, потым пачаў паказваць тоўстыя справы, якіясьці кнігі і паперы.—„Патурбуйцеся праверыць прыбыткі і выдаткі"—гавора ён. Я, нахмурыўшы лоб, пранікліва глянуў у іх, не прачытаўшы аніводнага радку, прыкінуўся, што праверыў падрахунак: „Правільна,—кажу,—бывайце".—„Вось яшчэ—паліцыя, пажарная каманда,—гавора,—ці ня будзеце ласкавы глянуць?".

„Ах, чорт-бы цябе пабраў, тыран"—думаю. Надзвычай добра,—кажу, так і блішчыць! А пажарныя, якія малайцы!",—дадаў я, гледзячы на дробных, маленькіх чатырох салдацікаў у паношаных мундзірах.—„Мундзіры навенькія!" падсьмейваўся я. Я пачаў пальчаткі адзяваць: толькі адзін палец чамусьці ня лезе—што такое? Я перавярнуў пальчатку: з пальца мне на калені пасыпаліся залатыя, штук дваццаць. Я спрытна падабраў, схаваў у кішэнь. „Бывайце,—кажу, падняўшы шапку,—у вас усё ў найлепшым парадку, вы вузорны чыноўнік,—так і перадам губарнатару"...

Прыехаў у С. Тая-ж гісторыя: начаваньне ў гараднічага, добрая вячэра з шампанскім. І дзе яны толькі яго бяруць у гэткай глушы? На другі дзень такі самы агляд і ад'езд. Разьвітваюся, надзяю пальчатку; зноў палец ня лезе і пальчатка ня лезе. Мне гэта спадабалася; Далей я ўжо сам пачаў глядзець—ці цікавая пальчатка і ці лезуць пальцы.

— Вы, можа, думаеце, што ён жартуе?—сказаў мне сакратар, сьмяючыся —зусім не: гэта так і было.

— Якія жарты!—Амаль пакрыўджана заўважыў апавядальнік.—Вярнуўшыся пасьля рэвізіі, я за абедам у губарнатара расказам пацяшаў усіх.

— І губарнатар чуў?

— Як-жа, ён больш за ўсіх сьмяяўся,—кончыў апавядальнік.

— За што-ж вам давалі?

— Як-жа за тое, што не глядзеў і ня бачыў нічога.

Палітычнае жыцьцё гораду было ледзь прыкметнае; буйнейшыя падзеі ў Расіі, не гаворачы ўжо аб тым, што рабілася за мяжой, даляталі да Сімбірску толькі водгукамі. І яшчэ ў 80-х гадох мінулага стагодзьдзя ў горадзе ня было рэволюцыйных арганізацый.

Колькі небудзь афармленыя рэволюцыйныя арганізацыі пачынаюць зьяўляцца ў Паволжжы толькі ў пачатку 90-х гадоў і зьвязаны, галоўным чынам, з арганізатарскай дзейнасьцю Н. Е. Фэдосеева, што адзначае Уладзімер Ільліч у артыкуле „Некалькі слоў пра Н. Е. Фэдосеева".

„Н. Е. Фэдосееў быў адным з першых, якія пачалі гаварыць пра сваю належнасьць да марксыцкага напрамку... Для Паволжжа і для некаторых мясцовасьцяй цэнтральнай Расіі роля, адыграная Фэдосеевым, была ў той час надзвычай высокая і тагочасная публіка ў сваім павароце да марксызму, бязумоўна, адчувала на сябе ў вельмі і вельмі вялікіх памерах уплыў гэтага надзвычай таленавітага і надзвычай адданага сваёй справе рэвалюцыянэра".

Дом Ульянавых на Маскоўскай вул., дзе Ульянавы жылі з 1875 году.

На маладога Уладзімера, бязумоўна, уплывалі ўсе гэтыя акалічнасьці. Быт гораду з аднаго боку, а з другога ўплыў брата Александра, які быў павешаны царскім урадам, і наогул прогрэсыўныя настроі сям'і паклалі на маладога Уладзімера свой адбітак.

Уладзімер Ільліч быў адным з лепшых вучняў гімназіі, у якую ён уступіў дзевяцігадовым хлапчуком.

Да гэтага ён вучыўся дома. Свае раньнія дзіцячыя гады Ўладзімер правodзіў гэтак, як і большасьць дзяцей таго часу і яго асяродзьдзя: улетку—у бясконцым блуканьні па берагох Сьвіягі з вудачкай у руках, або ў бязьмежных гарадзкіх садох, узімку—у хаце сярод сваіх, у вузкім коле равесьнікаў—таварышоў.

Бялявы, з карымі вачыма, самы вясёлы ў сям'і, Уладзімер Ільліч, заўсёды спыняў на сябе ўвагу ўсіх, хто наведваў дом Ульянавых сваёй кметлівасьцю ў адказах на запытаньні і вясёласьцю.

Дырэктар гімназіі Ф. А. Керэнскі, бацька А. Ф. Керэнскага, са ўсёй рашучасьцю праводзіў у сваёй гімназіі „палітыку ізоляцыі". Апроч кола таварышоў па гімназіі ў Уладзімера Ільліча былі сябры сярод дзяцей знаёмых яго сям'і, але як таварышы па гімназіі, гэтак і дома ніхто ня ўносіў рэвалюцыйных думак.

Толькі, як Уладзімер перайшоў у апошнюю клясу гімназіі, у сувязі з нарастаньнем рэвалюцыйнага руху ў Расіі, а таксама дзякуючы ўдзелу ў гэтым руху брата Александра, Уладзімер Ільліч пачынае бліжэй знаёміцца з тымі палітычнымі абставінамі, у якіх у той час знаходзілася Расія. Прыкметная для блізкіх людзей замкнёнасьць Уладзімера Ільліча яшчэ больш узмоцнілася з моманту арышта Александра Ільліча.

Суворыя рэпрэсіі, якія пачаліся пасьля шэрагу тэрорыстычных актаў народавольцаў, далі новы напрамак яго думкам, і рэвалюцыйная хваля падхапіла яго.


Кара сьмерцю старэйшага брата, жандармскія рэпрэсіі, якія наваліліся на лібэральна-рэвалюцыйную сям'ю Ульянавых, яшчэ больш укаранілі ў Уладзімера Ільліча патрэбнасьць лютай барацьбы з царызмам.

Пры сканчэньні гімназіі Ўладзімер Ільліч быў кандыдатам на атрыманьне залатага мэдалю, які адчыніў перад ім унівэрсытэцкія дзьверы, але пакараньне брата, выклікаўшы няпрыхільныя адносіны з боку настаўнікаў, уплыла таксама і на настрої начальства; аднак, бліскуча вытрыманыя ім выпушчальныя экзамены прымусілі начальства выдаць Уладзімеру Ільлічу—першую ўзнагароду.

Дырэктар гімназіі паслаў у Казанскі унівэрсытэт наступны „водзыў аб вучні Ульянаве Ўладзіміры".

„Ульянаў Уладзімер, вельмі таленавіты, заўсёды старэнны і акуратны. Ульянаў ва ўсіх клясах быў першым вучнем і пры сканчэньні курсу нагароджаны залатым мэдалем, як найпаважанейшы па посьпехах, разьвіцьці і паводзінах.

„Ні ў гімназіі, ні па-за яе сьценамі ня было заўважана за Ўльянавым ніводнага выпадку, каб ён словам або справай выклікаў нядобрую думку аб сабе з боку начальства або настаўнікаў гімназіі. За вучэньнем і моральным разьвіцьцём Ульянава заўсёды дакладна наглядалі бацькі, а з 1886 г. пасьля сьмерці бацькі, адна маці, якая ўсе клопаты свае згуртавала на выхаваньне дзяцей. Добрыя вынікі хатняга выхаваньня, відаць, былі ў добрых паводзінах Ульянава.



Будынак гімназіі, дзе вучыўся Ў. І. Ленін.

„Прыглядаючыся бліжэй да хатняга жыцьця і характара Ульянава, я ня мог ня прыкмеціць у ім залішняй замкнёнасьці"...




Ў. І. Ленін пасьля паступленьня ў гімназію (1879 г.)

Гэтак пісаў дырэктар аб сваім вучні Ульянаве. І гэта вельмі характарна для гэтага пэрыоду жыцьця Ўладзімера Ільліча. Гэтыя зьявы былі як-раз вынікам пералому, які наступіў у яго за апошнія гады вучэньня ў гімназіі.


У гэты час ён упяршыню задумваўся над лёсам рэвалюцыйнага руху, упяршыню пачаў сур'ёзна думаць над палітычнымі пытаньнямі і цікавіцца імі для таго, каб пасьля вырасьці Леніным—правадыром сусьветнага пролетарыяту ў змаганьні за лепшае жыцьцё, за соцыялізм.

Бацькаўшчына Ільліча, бацькаўшчына вялікага Леніна—не Сімбірск: у Леніна няма бацькаўшчыны, яго бацькаўшчынай можна назваць кожны пункт на земнай кулі, дзе б'ецца пульс рэвалюцыйнай барацьбы.

Ад цэнтраў сусьветнае індустрыі—Эўропы і Амэрыкі—да далёкіх краін Азіі, Афрыкі і Аўстраліі,—Леніна ведаюць, Леніна любяць і ўсё з большай любоўю наведваюць шматлікія экскурсіі працоўных быўшы Сімбірск—сучасны Ўльянаўск, дзе вуліцы, сады, будынкі напамінаюць пра далёкае мінулае Уладзімера Ільліча.



ЛЕНІН У СМОЛЬНЫМ



УЛАДЗІМЕР ІЛЬЛІЧ ЛЕНІН У СВАІМ ПРАЦОУНЫМ ГАБІНЭЦЕ У СМОЛЬНЫМ У 1917 ГОДЗЕ.

Праца мастака І. БРОДСКАГА.



Як Юзік скажа

Апавяданьне

Цішкі Гартнага.

ЗАСОПШЫСЯ, раззлаваны Ёсіп увашоў у хату і сеў на лаве. Марцэля паліла ў печы. Завіхалася каля блінцоў. Высокі касьцёр бухонікаў ляжаў на лаве. А ў дзежцы яшчэ палонік не даставаў дна.

Тэкля прыбірала пасьцель.

— Ёсіп, Тэкля, сьнедайце!

— Ябеднікі, круцялі, гарлапаны,—вылаяўся Ёсіп і сплюнуў.

Пасьля ўсхапіўся з месца і в.бег у двор. Стаўшы к усходу сонца, ён зрабіў рукою казырок на лобе і ўглядзеўся напрамкам к лесу.

Шырокі шмат бацькаўшчыны аглядаўся густою пшаніцаю, канюшынай і добра дагледжаным гародам. На градах, між чорных палос разораў, бялелі папер.чкі.

Ужо Ёсіп усе іх сьпісаў адзнакамі сартоў буракоў, капусты, гуркоў, сонечніку, брушкі. Хто ня ішоў між яго шмата — спыняўся і з цікавасьцю чытаў рознастайныя імёны гародн ны.

Большасьць дзівілася дбайнасьці Ёсіпа; некаторыя лічылі гэта вычварствам, а былі і такія, што раскідаста пацьвільваліся.

Сяды-тады мудрагель-хлапчук зрываў паперкі і падвешваў аскабалачкі або кав..кі цэглы. Але гэта рэдка ўцякала з-пад Ёсіпавага нагляду. Ё. настарожл'ва пільнаваў, папераджаючы крыкам злачынныя намеры мудрагеляў.

Часта было чуваць, як з-пад новага гумна трапацеў Ёсіпаў выразісты голас:

— Гга-а-ты! Ізноў-аў, паралюш на цябе-е... Што-а-а там робіш, трасца-а тваёй матя-ары.. Каб табе-э...

На гэты раз ён нікога не з.ўзажыў пры шмаце.. Мо' раней крыху і спыняўся вунь той, во, чалавек, што зараз завярнуў у бок кустоў...

Ды, прызнацца, Ёсіп вышаў на гэты раз паглядзець шмата зусім з іншай думкаю...

Ён моцна вагаўся між двума адказнымі для сябе намерамі: ісьці ці ня ісьці ў колгас.

Калі ісьці — то ўжо гэты шмат — не яго... Яму астанецца толькі ўсяго сядзібны пляц з калівам поплаву, а шмат... А ня йсьці—як ён можа на гэта рашыцца?..

Агітаваў другіх, угаворваў... Каму толькі не хваліўся пра сваю перадавітасьць!..

Сын нядаўначка быў у пабыўцы і таксама ўгаворваў сялян кідаць з прыватнаю гаспадаркаю і йсьці ў колгас. А сын як гаворыць—нельга не паслухаць ды не пераканацца — так угаворна і талкова ўсё перакажа...

Ёсіп хваліўся сынам і хваліў яго працу... А сын да гэтага—папісвае ў газэтах... Выкрывае хітрыкі кулакоў і агітацыю падкулачнікаў...

Сын, кожны скажа, зацята змагаецца за колектывізацыю. І каб гэта ён, Ёсіп, аст.ўся прыватнікам. Няёмка, брыдка нават...

Што яму скажуць людзі?

Вось яно дзе прыкра. А, ласьня, толькі што Ярмалай няпраўду казаў?

Ярмалай казаў праўду... Няпраўду...

„Ярмалай — пабрахун! Язык, як мешалка... Сем пятніц на тыдні... Сораму няма чалавеку—пры ўсіх як ляпне, адвесіўшы губеню, як... От ужо чалавек"...

Але Ёсіп ня мог адмовіць таму, што гэта Ярм.лай нагнаў яму столькі клопату і ўкінуў у злосьць, аж да поту прабрала...

„Ну, шмат... Столькі працы паложана ў яго... Гэта-ж ад працы чалавек мае каляцы... за.інь, што ён варт будзе... А папацееш, папаходзіш — і пшанічка, і бурачок, і тытуню кусьцікаў з дзесятак... Шмат... хіба ў Юркі запытаць?.. што Юрка скажа"...

Марцэля звала Ёсіпа на блінцы.

— Пастынуць—ідзі зьеш цёплых...

Яна заўважыла, што муж ня ў гуморы.

— Ёсіп! Блінцы пастынуць...

Марцэля выказала гэта настойна і непаўторна. Або ён ня ведаў яе натуры?

— Як скажа, дык... От, к.беціна, як крэмень... А на што іншае... Ён павярнуў да дзьвярэй ..

— Дзядзька Шымарэвіч! Дзядзька Ёсіп—ліст... ад Юркі...

— Ах вонь, Уладзік... Ліст кажаш... З Менску мо?

Касавокі, гумарлівы лістаносец працягваў Ёсіпу зялёны канвэрцік... І, як заўсюды, песьціў кеплівую ўсьмешку...

— Не забывае сын..

— Дзякуй яму...

— У колгас раіць?

Ёсіп нічога не адказаў.

А з-за вакна Марцэля замармытала—злоязычна, але так, каб Уладзікх не пачуў:

— Гарліца на яго... Вэндысь гэты кручоны... Ы-іх, плявузьнік...

— Маўчы і, пачуе...

— Чорт яго матару бяры... Або-ж можна з старога чалавека пацьвільвацца! Голік гэты... Цьфу!

-- Кіньце, мама.

Тэкля правяла ў вакно лістаносца і хапілася за блінцы.

— А ліст?

— Дай бацьку спакойна пасьнедаць.

Марцэля вырвала з Ёсіпавых рук ліст, павярцела яго на ўсе бакі і горніва завяла:

— Ой, дзякуй-жа табе, сынок наш... Юзічак мой залаты... Бачыце—не пакідае, родны, бацькоў... То ліст, то грошы... Каб яму бог спорыў, Юзіку, бач...



Колгасьніца-ударніца колгасу „Чырвоны Пагранічнік“.

— Так, дзякаваць яму... Без яго ні табе тое, ні табе гэта... Парада-ж тая заўсюды... Хоць бы і зараз — ласьня, ведаеш, куды табе пэхіліць... Гэты шалаплут, Ярмалайка, сярод вуліцы стрэў і як хлёраў лыска—гаў, гаў, гаў... Каб, здэцца, прымеў—так і аплявушыў-бы, але—людзі...

Марцэля як паднясла блінец к роту — так і застыла з ім, адно зьдзіўлена вытрашчыла вочы на мужа.

— Ізноў?

— От і дай ты рады: нас, кажа, з сынам разам угаворваеш, а сам аграном'ю разводзіш, хаваешся... Апушыўся шматам да сынавай падмогай...

Ёсіп ажно закалаціўся. На чарствым твары яго прабегла дрыготка і шарыя вочы заблішчэлі агнём. Ён моцна злаваў...

— Еш ужо, хай яго скулы зьядуць... Вось і ўдаецца некая немач—няма на яго цурахі... Кекша гэта брудастая... Вочы коле шмат... Нажыві—запрацуй, Яўмен няшчасны.

Накладзены касьцёр блінцоў вочавідкі зьніжаўся.,. Дарма, што лаянцы ня было спыну...

— Мо падзапьеш малакам?

— Годзі... Тэкля—прачытай, нябога, ліст...

Ёсіп абцёр далоньню вусны і хапіўся за капшук з тутунём.

— Што хаця сынок піша... Марцэля, кінь ужо з прыбіркаю, давай паслухаць...

І праз хвіліну, толькі Тэкля разгарнула ліст, каб пачаць чытаць, Ёсіп падняў руку і запытаў:

— Я думаю так: параіць Юзік ісьці ў колгас — пойдам... Пойдам і аддамо... Марцэля?

— Ты, займа здароў, прэшся ў колгас... Не пасьпееш вельмі... Будзе час...

— Чытай, Тэкля...

Павіткі дыму з люлькі разьнясьліся па хаце: запахла моцным самасеем...

— Адхіліся, на цябе чмуць... Смокча, ды смокча, як суслу...

— Маўчы... Пачынай,—Тэкля.

„Дарагія бацькі...

Даруйце, што на гэты раз зацягнуў з адказам. Ведаеце — процьма спраў... Надовечы езьдзіў на раён... рэдакцыя пасылала. А пасьля вёў дасьледзіны ў прыгародных колгасах..о Ад раніцы да ночы — заняты... Зьбярэшся, а тут, нечакана, новая работа... Круцішся, як у малатарні... Трэба, ведаеце, час такі, прыпар... разгайданы тэмп соцыялістычнага будаўніцтва"...

— Чакай!

Ёсіпава рука паднялася ўгору.

— Во, бачыш, як ён там жыве... А ты-бо кажа ш...

— Нічога я не кажу—ведама што...

— Далей, дачушка...

„Жыву па-старому... Тая-ж кватэра, на той-жа вуліцы... Думаў пераменіць — ды няма часу... Але пра сябе годзе... Прагуся ведаць, як вашы справы... Пэўна ўжо ў вас начаўплося ўсялякіх навін?.. Цяперака, бачыце, жыцьцё імчыцца, як ветрам, во-а-а! На ваччу адбываюцца нячуваныя зьмены, перабудова... Колектывізацыя... Так, дарагія бацькі, апошняе больш усяго і цікавіць мяне... Напэўна ваш сельскі колектыў жыве і працуе. Сяляне запісваюцца і... Трэба бацькі, канчаткова рашаць і вам. Вы пісалі ў астатнім лісьце, што яшчэ ня вырашылі з гэтым — ісьці, ці ня йсьці ў колектыў... Вы пытаеце ў мяне, як вам рабіць: ідзеце. Ідзеце ў колектыў і больш нічога. Хоць вы абое і пажылыя людзі, усё-ж бацька яшчэ можа з бараною прайсьціся, а маці даглядзець курэй, сьвінча якое... Тэкля будзе працаваць... Ідзеце! Чаго доўга думаць—абавязкова запісвайцеся"...

— Вось табе як!

— Чытай, Тэклечка.

„Я ведаю, што вам шкода шмата: добрая зямля, блізка, што захочаш—ссй; нічыё ня дзела. Але бацькі! Гэта больш прывычкі, як выгады... Падумайце самі—колькі клопату. За канём—глядзі, начыньне рапаруй, аб гноі клапаціся... Не-э. Гэта здаецца ўсяго, што свой кавалак зямлі—дык... А сапраўды яно начай... Каб лепш жыць і будаваць новы лад—трэба запісвацца ў колгас. У колгасе вы—члены вялікае дружнае сям'і працаўнікоў... Колгас — грамада... Тут вам і новая машына, і парашкі для ўгнаеньня, і спорая супольная праца... Ні платоў, ні меж... Ні пераараць, ні перакасіць... Глянуў, а вакола прастор і ўвесь усіх... Вы падумайце, бацькі"...

„Вы пісалі: ня ўсе людзі запісваюцца. Так — ня ўсе. Але запісваюцца перадавікі, тыя, хто лепш разумее наш час... Хто поўнасьцю спачувае нашай уладзе савецкай... Вы кажаце, што некаторыя выступаюць супроціў колгасаў. Зразумела—будуць такія, яны ёсьць... Навошта кулаку або фальбаркоўцу колгас, калі ў ім давядзецца самому працаваць... На другіх выжджаць—годзе... Пярэчаць тыя, каму люба старое...

— Або няпраўда, Марцэля?

Марцэля недаўменна разьвяла рукамі і нічога не адказала.

„Няхай бацька ўспомніць: у маладыя гады ён сам прымаў удзел у соцыялістых... І да рэволюцыі ім спачуваў... І ў апошнія гады ніхто на яго дрэннае слова не сказаў... Вагацца даволі..я Колгас — больш нічога... І мне, дарагія бацькі, хацелася-бы ўжо бачыць вас колгасьнікамі, як прыеду дамоў... Гэта мая вам сынаўская парада".

— Ну, што скажа-ш?

— Ідзі,—пішыся!..—парадзіла Марцэля.

— Тое ж і твой сын.

— Пішыся,—цьвярдзей дадала яна.

„Я прашу вас паведаміць мяне, як і што вы зробіце... Яшчэ раз хачу папярэдзіць: шмата шкадаваць ня трэба. Быў-жа час, калі яго ў вас на было? А гэта вы будзеце сябрамі цэлае суполкі, якая валодацьме вялікаю і багатаю гаспадаркаю... І пасеяць і пажаць — уся разам, усё ў хаўрусе... Так што канчаце думаць, бацькі, не чакаючы, уваходзьце ў лік колгасьнікаў... Бывайце здаровы. Чакаю адказу Ваш сын Юзік".

— Дай сюды, Тэкля, ліст!

Ёсіп пераняў з даччыных рук прадоўжную палоску паперы і ўважліва паўзіраўся ў сынава пісаньне.

— Так, піша, каб уступалі ў колгас, во, — правёў ён пальцам пасярэдзіне лісту.

— Або Тэкля няправільна прачытала? Піша—значыць піша.

— Значыць піша і таквэля Юзік-жа нам дрэннага нічога не жадае...

Ёсіп накінуў жукетку, адзеў шапку і вышаў з хаты.

У двары ён спыніўся і адвярнуўся ўбок шмата.

— Колгас—то гэта будзе, во, увесь той прастор... І калі я прыстасую свой вопыт на гародную гаспадарку—колгас ад яе аднае стане на ногі... Пане мой,—усю лагчыну, вось, па той, вунь грудок як парэжам на грады!

Апошні сказ ён праказаў учуткі, зусім не заўважыўшай вышаўшай за ім Марцэлі.

— Засееш...

— Так, засеем. Юзік адгадаў маю думку; цэліў... Толькі ў колгас... Няхай-жа Ярмалайчык заткнецца... Будзе-ж ужо-о... Аман... Тыкну я яму пальцам .. У колгас Марцэля...

Ёсіп павярнуўся к выйсьцю з двара.

— Можа-б заўтра, Ёсіп?

Марцэліны словы завязьлі ў скрыпе вешніц.

Гледзячы ў вакно, Тэкля ня спусьціла з бацькі воч, пакуль ён не схаваўся ў будынку сельсавету.

НАКОНТ ГАРШКОЎ

ЯК і кожны год—сыстэматычна,—зноў надыходзіць вясна... І вясна зноў, як і кожны год,—сыстэматычна сур'ёзных людзей штурхае на сыстэматычна нясур'ёзныя ўчынкі...

— Бач,—Галубок у апошняй сваёй драме не павесіў ніводнага свайго героя.

Бэндэ дараваў памылку Зарэцкаму.

Юлі Таўбін спаліў дваццаць аркушоў свайго апошняга перакладу.

Задумаўся і Белкоопсаюз...

... Недзе ў Тамбоўскай губэрні задумаўся Белкоопсаюз. Стары Гурын робіць дзівосныя справы...

Пасодзіць стары Гурын пшаніцу, зробіць ёй прывіўку жыта, глядзіць стары Гурын—вырастае з усяго гэтага новы гідрыд...

Доўга цікавіўся гэтай навуковай працай наш цікавы Белкоопсаюз.

І нарэшце здалёку пачала надыходзіць хвалюючая думка.

... У Тамбоўшчыне з двух і трох сямян зусім розных расьлін вырастае новая зусім трэцяя расьліна...

І далей...

А што, каб гэтыя цікавыя вопыты ды на Мазыршчыну.

Ды не ў акруговых, а ў рэспубліканскіх памерах...

Ды каб ня з дробнымі там зярняткамі валаводзіцца, ня персікі якія-небудзь там выводзіць для асалоды, а каб фрукт вывесьці сур'ёзны і вясёлы, і каб да вясеньняй пасеўнай кампаніі яго...

Абмеркаваўшы на гэтую тэму паслаў Белкоопсаюз старшыні Мозырскага аддзяленьня наступную адносіну: „Мазырскі Цэрабкоп. Старшыні праўленьня:

Начныя гаршкі пасылаюцца вам ад Белкоопсаюза для абслугоўваньня пасеўнай кампаніі".

Паслаў, значыць, Белкоопсаюз начныя гаршкі ў Мазыршчыну ды і чакае.

Трывожныя дні прайшлі для Белкоопсаюза...

Які, — цікавіцца Белкоопсаюз,—з начных гаршкоў гідрыд вырасьце?..

Чакае Белкоопсаюз і шляхетна маўчыць пра свае дасягненьні...

Спакойна, значыць, ціха без непатрэбнай для сур'ёзнай справы чакае вынікаў.

Утром, значыць, Мігурынскаму пітомніку нос і ўсё тут...

Нам большага і ня трэба...

Маўчыць Белкоопсаюз, а трывога расьце.

— Ці ня мала ім начных гаршкоў паслалі? Расьце трывога...

А за трывогай ляціць новая адносіна Белкоопсаюзу ў Мозыр.

Наступная адносіна:

„Сэктар грамадзкага харчаваньня Белкоопсаюзу высылае вам начныя гаршкі ў колькасьці пяцідзесяці штук. Выкарыстайце іх для вашых мэт"...

Кажуць, што мозырцы вельмі ляконічна адказалі на гэтую адносіну:


— Выкарыстоўваем,—адказалі—.., для сваіх мэт... без патрэб не датыркаемся...

... Белкоопсаюз задаволена чакае...

Ну і мы чакаем...

Праз пяць-шэсьць месяцаў увосень, калі ўраджай пасьпее, справа і высьветліцца... І, які, яно цікава, з начных гаршкоў гідрыд вырасьце.

Алёша.









ВЯСНА ЎО

Тры тыдні
упарта вясна наступала,
Тры тыдні
давала зіма адбой...
І кроў ледзянела
ў разлогі сьцякала,
і рэкі ўздуваліся
тэю крывёй...

Масты ледзяныя
ўзрываліся з громам
І з грукатам, скрогатам
рушылі ўніз,
І сонца—прожэктар
з каманднае стромы
Шалёна сьвяціла
на поле вайны...

І тройчы вяртаўся назад
люты вораг,
І ў бойцы астатняй
разгромлены быў...
Цяклі ручаіны
ў лагчынах, разорах...—
...І ўжо падыходзіў
час сяўбы...

У бездараж тую,
тры дні й тры ночы
Ў далёкі колгас
прабіраўся абоз.
Ён з гораду вёз
брыгаду рабочых,
Ён з гораду
слаўных хлапцоў вёз.

І ўпартыя ногі
у ботах юхтовых,
Што колісь хадзілі
ў атаку ня раз,
Бяз лішняга шуму,
бяз моцнага слова
Спакойна мясілі
дарожную гразь ..

Быў сэнс найглыбейшы
у моманце гэтым:
Суровая мудрасьць
жаданьняў і мэт...
Вялічная ўздумнасьць
стаяла над сьветам
Ў косьмічным суладзьдзі
бязьлікіх плянэт.

І лепшая з іх,
што завецца зямлёю,
Улоньне сваё
расчыняла вясьне,

...ЎОЛГАСЕ.

Аддацца,
каб кожнай сваёй баразною,
І новым насеньнем
ізноў запладнець.

І радасьць была
нявымерна глыбокай,
Сьвяціліся ў вочах
праменьні яе,
Як выйшлі колгасьнікі
ў поле далёка,
Спаткаць, каб
брыгады чаканы прыезд...

Ужо набухалі
пупышкі на вецьці,
І гнёзды зьвівалі
на дрэвах гракі,
А дзіўная праца
ішла пад павецьцю,
Сьпявалі жалезны свой сьпеў
малаткі.

І бачна было,
што колгас не асіліць,
Каб выйсьці у поле
гатовым, у час...
Але аддавала
брыгада ўсе сілы,
Каб вывесьці ў строй
на сяўбу колгас.

І праца кіпела
штодня да паўночы,
І сыпаўся
поту салёны град...
Здаліся машыны
рукам рабочых
І сталі
адна за другою у рад

І радасьць была
на колгасаўскіх гонях,
І вусны тэй радасьцю
буйна цьвілі,
Як выйшлі на поле
жалезныя коні,
Плугі уразаючы
ў цела зямлі...

Ударнікі цэхаў
вярнуліся ў горад...
Ударнікі поля—
на кліч баразны.
Так воляй упартай
і працаю спорнай
Быў выканан плян
бальшавіцкай вясны.

Алесь Звонак.









НАРАДЗІЛАСЯ ТРЫНАЦЦАЦЬ—ІМЯ КОМУНАР

Нарыс ВАСІЛЯ СТАШЭЎСКАГА

Сабралася ў Райвыканком чалавек восемнаццаць Калі рабіць колгас, значыць рабіць яго сёньня, бо час не чакае.

— Позна ўжо. Праз які тыдзень трэба ісьці ў поле.

Гудзе сход.

— Запісалася ў колгас дваццаць два. Тут прысутнічае восемнаццаць,—абвяшчае старшыня сходу.

— Я прышла, каб выпісацца.

— Хто там хоча выпісацца?

— Я—Сымоніха.

— А Сымон пра гэта ведае?

— Няхай сабе ведае, ці ня ведае, а я заяўляю.

— Ну, што-ж, сілком ніхто трымаць ня будзе.

— І я таксама не магу састаяць,—заяўляе стары Анісім.

— А вы, дзядзька, чаму ня можаце састаяць?

— А так, што слабы здароўем і хачу памерці ў сваёй хаце.

— Дык-жа з хаты вас ніхто чапаць ня будзе.

— Не, я не пайду. Няхай запісваюцца ўсе, дык пры канцы і я. А да суседа: ня будуць чапаць... Кось, кось пакуль у аглоблі.

— Таварышы, ніякага высяленьня з мястэчка вас ніхто рабіць ня будзе. Мы аб гэтым некалькі разоў казалі: ня слухайце провокацыі. Партыя і комсамол будуць усімі мерамі дапамагаць вам, першым організатарам соцыялістычнай гаспадаркі ў мястэчку.

— А чаму мы павінны быць першымі, няхай хто другі,—падаў голас той, што „хачу памерці ў сваёй хаце".

Тут ужо некаторыя з маладых колгасьнікаў ня ўтрымаліся:

— Ідзі ты, дзядзька, на сваю печ і не раскідай нам справы.

— Ну дык і пайду.

— Ідзі.

Стары не пайшоў. Ды ніхто, апрача Сымоніхі, не пакінуў сходу. Аднак, у колгасе з дваццаці двух чалавек засталося дванаццаць.

— Таварыш землямер, нарысуйце на дошцы плян зямельнага вучастку.

— А мы ведаем. За рэчкаю.

— Нічога, няхай нарысуе.

У землямера ёсьць некалькі плянаў на паперы. Адзін з іх ён дае патрымаць і, відаць, з яго крэйдаю пераносіць на дошку.

Шчыльней згуртаваліся колгасьнікі каля дошкі. Наперадзе сядзіць, прыжмурыўшы вочы, Ціхон. Углядаецца стары ў тыя рыскі, якія выводзіць землямер, думае, і яго фантазія таксама рысуе плян.

У гэты час да стала падышоў малады рослы ў вайсковым шынэлі хлапец.

— О-о-о... Дзяніс.

Ціхон падняў галаву, глядзіць, не пазнае свайго сына. Дзяніс адразу пазнае бацьку, проста па шапцы, па кажушку. Вітаецца з усімі, нарэшце з бацькам. З усімі вітаўся па вайсковаму, браў пад казырок. Узяў і бацьку. Але тут-жа нагнуўся і, па ранейшай прывычцы, пацалаваў бацьку ў руку.

Такая радасьць, якую адчуваў цяпер Ціхон, рэдка бывае Старшыня Райвыканкому нядаўна ў гэтым раёне. Дзяніса бачыць першы раз, але чырвонаармейскі шынэль падбадзёрыў і яго.

— На пабыўку, таварыш?

— Так, на пару дзён.

— Гэта твой бацька,—паказвае старшыня на Ціхана.

— Так.

— Падрывае нам усю работу. Ня ведаем, што з ім рабіць.

Ціхану гэты жарт старшыні спадабаўся. Ён з лёганькай усьмешкай глянуў на старшыню і зараз-жа апусьціў вочы, бо цяпер усе глядзелі на яго.

— Комсамолец?—пытае старшыня Дзяніса.

— Кандыдат партыі.

Ціхан расьце. А ў думках: „от псяга і не напісаў".

— Далёка дзе служыш?—пытае старшыня.

— Я дэмобілізаваны. Цяпер працую ў рэдакцыі.

Землямер глянуў на Дзяніса, пасьля зрабіў на дошцы яшчэ некалькі рысак і далажыў.

— Ну вось прыблізна ў асноўным плян вучастку.


За рэчкаю, насупраць сядзібы Ясіноўскага, на лепшым кавалку зямлі напісана: 170 *га*. Гэта пад яравыя засевы. Увосень плошча пашыраецца ў бок балота.

— А калі ў нас будзе не дванаццаць, а трыццаць сем'яў?

— Тады яшчэ лепш: тады займаецца ўся плошча да самага лесу.

— А калі будзе 100 сем'яў?
— А тады займаем і на гэты бок рэчкі.
А тут малавата будзе зямлі. Калі-б далучыць сюды Драздоўскія хутары, а тады-б вышла якраз.
— О, іх цяжка паварушыць гэтых хутаранцаў,—падаў голас Ціхон.
— Нічога, паварушым, дзядзька,—адказвае старшыня. Я думаю што колгас іх сумее паварушыць, як сьледуе.
— Вучастак зямлі добры, няма чаго казаць, а вось аб'езд дрэнны. І далёка і грэбля паскудная.
— Дык вось я хачу сказаць далей,—зварочваецца землямер,—сёлета-ж мяркуецца асушка балота. Гэтая дуга рэчкі, якая падыходзіць да гароду Ясіноўскага, дзе, значыць, будзе комбінат, выпрамляецца. Адносіцца далей.
— Як, адносіцца рэчка?
— Так, будзе пракапана новае русла. А ў проекце мы маем новую грэблю, якая будзе ісьці ад камбінату, проста на ваш колгасны вучастак. Значыць, тут-жа будзе пабудаваны новы мост.
— І гэта будзе зроблена на працягу гэтага лета,—зазначае старшыня.
Шмат яшчэ гутарылі аб пляне. Разрасталася творчая фантазія маладых колгасьнікаў, Толькі некаторых брала сумненьне наконт балота:
— Кажаце, балота? Хоць сенажаць і паша дрэнная, але ўсё-такі ёсьць, а тады можам застацца і бяз сена і бяз пашы.
Тут узяў слова Дзяніс.
— Я, таварышы, за свой кароткі час прабываньня ў рэдакцыі два разы выяжджаў на раён, дзе зроблена мэліорацыя. Тое, што там пасьля асушэньня вырасла за адзін год, дык старое балота не дало-б таго за пятнаццаць год.
І Дзяніс даў малюнак буйных зялёных аўсоў, вікі.
— Касою не павернеш. Паехаў я, калі была ўборка. Такое гушчыні коп найлепшых харчоў я ня бачыў.
Слухаюць колгасьнікі. Калі-б можна было ў гэты момант сфотографаваць іх уяўленьні, мы ўбачылі-б: аднаго сярод густых коп вікі з аўсом, другога з возам вікі па новай дарозе, трэці стаіць з возам каля свайго невялічкага гуменца і думае, як яго ўціснуць у дзьверы, чацьверты складае вялікі стог, пяты вялікую адрыну і г. д.
А вось адзін з іх шосты, ці дванаццаты, гэта ня важна, падаў голас:
— Ну, а калі ўсё мястэчка пойдзе ў колгас, дык як мы тады будзем дзяліць зямлю?
— Ха-ха-ха!—выбухнуў сьмех. Адзін хлапец дык траха не зваліўся з табурэткі.
— Чаго ты пакаціўся!—закрычаў ня яго гэты чалавек.
А Ціхан зварочваецца да яго:
— Колгас-жа, ён не падзяляе зямлі, а злучае каб значыць у адно.
— Ну, дык я ведаю. Гэта ўсё ў адно месца?
А той малады з табурэткі:
— Зямлю-ж не пацісьнеш так, як сьнежку. Разараў межы, вось табе і ў адным месцы.
— Ну, дык я ведаю. Але гэта будзе такі кавалак?
— А ў саўгасе як?—задае пытаньне Ціхан.
— Я ведаю...
— Нічога, дзядзька. Кавалак зямлі вызначаны. Пачынайце гуртам, колектывам працу.
Падняўся той, што „ў сваёй хаце памерці".
— Я слухаў тут... і так што скажу, як гласіць мая галава. Калі так яно ў парадку пойдзе, як тут казалі, тады і я застаюся.
— А вы-ж выпісаліся,—адказаў адзін.
— А я прашу, так што, назад упісаць.
— Няхай сам дасьць расьпіску, а то будзе па дваццаць разоў выпісвацца.
Дзядзька з крыўдаю адказвае:
— Добра табе гаварыць пра расьпіскі, калі ты граматны. А мяне хто вучыў?
Далей зварачваецца ён да старшыні:
— Таварыш старшыня, так што я няграматны і прашу вас даць за мяне расьпіску.
— Добра, дзядзька, я за цябе паручаюся,—адказаў старшыня.
— Прымаем—зварачваецца ён да колгасьнікаў.
— Прымаем—адказалі хорам.
І ў гэтым простым галасаваньні кожны адчуў магутную сілу колектыва.
Назва яго—Комунар.
— Тады ўпішэце і мяне,—адазваўся адзін моцы сераднячок Марчук, калі комунараўцы скончылі сход.
Пытаньне з Марчуком засталося адчыненым.

Позьнім вечарам выходзілі з памяшканьня Райвыканкому трынаццаць маладых колгасьнікаў-комунараўцаў.
— Дык колькі-ж гэта нас? Здаецца трынаццаць.
— Трынаццаць.
— От на яго дзіва, няхай-бы адным больш альбо адным менш.
— Чаму?
— Лічба такая.
— Плюнь на забабоны.
— Ды яно-ж так, але народ пачне выдумляць штукі.
— Няхай выдумляюць. А мы арганізаваліся і пабачым, што выйдзе з іх сьмеху.
Месяц скрыўлена пазіраў з-за цьвінтара. У ім, відаць, адбіўся настрой тых, хто трывожна тупаў па мястэчку і чакаў вестак са сходу: „колгас раскілаўся" і пачуў „колгас ёсьць". Імя яму—Комунар.
Няпрыемная сёньня „лічнасьць" у местачковага месяца.
— Бачыш, як скрыўлена паглядае ён.
— Гэта паглядае Ясіноўскі,—жартуе малады комунаравец.
Слова „Комунар" абляцела ўсё мястэчка.
Адзін Сайка балагол закінуў яго ў хат дзесяць.
Комунар!
Комунар!
Трынаццаць!
Трынаццаць!
Гарэла газовачка ў варажбіткі Аўдолі. Тры жанчыны схіліліся над ёю.
— Скажэце, бабулька, як яно будзе?
Варушыцца старая на прымурку:
— Што, ня чую, галубкі...
— Скажэце нам пра жыцьцё.
— Ня чую, галубкі.
— Пра жыць-цё.
— Ня чую, галубкі.
— Пра жыць-цё.
— Ня чую і ня ведаю, галубкі мае.
Адна палажыла кавалак сала. Бабулька пашавялілася і дастала з пячоркі карты.
— Іх трынаццаць чалавек бабулька.
Марудна раскладаюцца карты. Трасуцца рукі. Шавеляцца губы.
— Трынаццаць, кажаце... так і паказвае. Нічога ня будзе. Трынаццаць, ды яшчэ на сыходзе маладзіка... Нічога ня будзе. Усё будзе добра—шыпела старая баба-варажбітка.
А ў хаце, у невялікім гурце сям'і і яшчэ трох колгасьнікаў разьвіваліся гутаркі сходу. Расказвалі Дзянісу пра ўсе местачковыя навіны, пра тую брахню, якая сыпецца на іх, організатараў колгасу, на Камітэт, пра тое, як Ясіноўскі ходзіць і сябруе з Іванам Падзёньнікам, з Сымонам.
— Спачатку ўсе казалі: „гэта яўрэі хочуць выкінуць хрысьціян у колгас, каб самім застацца ў мястэчку... „А сам, нябось, з нэпманамі сяброўства трымае".
— Пазабіраюць,—кажа,—лепшыя гароды. Комбінат заграбае вакол сябе лепшую зямлю. Ім будзе выгада, а нам злыбеда.
— Гэта пра злыбеду ня ён казаў, а Іван.
— Ну, а Івана хто навучыў? Думаеш сам Іван такое выказвае? Ён цягне тую нітачку, якую даў Ясіноўскі. А дзядзька адказвае Івану: „А які ў мяне ці ў цябе гарод? Калі-б прышлося выкапаць упоперак магілу, дык і ня хопіць. Мёртваму ня хопіць, а ня тое, што жывому".
— Ясіноўскі часта і да мяне пад'яжджаў—дадае Ціхан. Трэбуй,—кажа—зямлі з саўгасу. Напішы сыну, каб з Чырвонай арміі напіскаў.
— Цяпер, як пачалі вазіць бярвеньне на гарод, дык ён і апусьціў галаву.
— Сьмешна вышла ў яго з Сымонам. Частаваў, частаваў таго, пазычыў хамут, а як убачыў, што той прывёз бярвеньне на гарод, дык на другі дзень паслаў хлопца сыскаць. А мы яму кажам: не аддавай пакуль што, вазі бярвеньне, а пасьля аддасі. Дык ён нешта з тыдзень вазіў.
Шмат аб чым расказвалі Дзянісу, а Дзяніс ім.
Вячэрала.
І трэба-ж гэтай маці, зафарбавала чарніцаю і паставіла на стол пляшку. А Дзянісу наліла ў кубачак чаю з жалудоў.
А назаўтра чарнілі падкулачнікі Ціханаву хату. Падгледзілі ў вакно. „Колгасьнікі гуляюць, радахтар Ціхонаў кубкам п'е... Як бачыш спалошчуць гэты колгас".
На другі дзень сакратар райкому партыі пытаўся ў Дзяніса. Дзяніс расказаў як было.



ЛЮДЗІ, ЯКІЯ ШТУРМАВАЛІ НЕБА

Нарыс Л. КЛІМЧУКА

Абкружаны нямецкім войскам Парыж памірае з голаду. Конскае мяса лічылася раскошай. Елі сабак, кошак, пацукоў. Пры 17 градусным марозе прыходзілася гадзінамі выстойваць у горадзе, каб атрымаць галодны паёк. Паміралі дзеці ля высахшых грудзей. Дровы цаніліся на вагу золата. Рабочыя, страціўшы ўсякія заробкі, вымушаны былі прахарчавацца толькі на тыя мізэрныя грошы, якія яны атрымлівалі, як нацыянальныя гвардзейцы.

Не на многа лепш было становішча служачых. Сьмяротнасьць у Парыжы павялічылася ў 10—15 разоў.

А як раз гэтага і хацеў буржуазны ўрад „нацыянальнай здрады", — каб заключыць мір і прыдушыць рэволюцыйны Парыж.

Узбураныя народныя масы даюць волю сваім думкам у парыскіх клюбах.

— Комуна! Комуна!

На комуну ўсе надзеі. Комуна здолее ня толькі прарваць прускую аблогу, але і знойдзе схаваныя спэкулянтамі, буржуямі і манахамі хлеб і продукты. Комуна выратуе Парыж, а з ім і ўсю Францыю,— вось аб чым гаварылі на сходах, вуліцах, клюбах, майстэрнях.

А тым часам буржуазія рашыла пакончыць з Парыжам, гэтым рэволюцыйным вульканам, горадам бунтароў, выкарчаваць яго незалежнасьць і правадырства над усёй Францыяй.

Ня сьпіць і Парыж. З часу капітуляцыі перад прусакамі Парыж амаль цалкам належаў нацыянальнай гвардзіі, якая зьяўлялася вялікай сілай і пры тым пролетарскага характару. Ужо 24 лютага 1831 году, калі меркавалася, што ў гэты дзень прусакі ўвойдуць у горад, па закліку Цэнтральнага камітэту нацыянальнай гвардзіі, зьявілася 40 тысяч гвардзейцаў, гатовых сваім жыцьцём заплаціць за недатыкальнасьць да Парыжу.

Нацыянальная гвардзія падмацавала свой уплыў законам 400 гармат, адлітых у свой час на народныя грошы, сабраныя па падпісцы. Гэтыя гарматы былі зараз сабраны ў рабочай ваколіцы Парыжу на Монмарце.



Адпраўка лістоў палонным комунарам.

Старшыня ўраду „карлік-нагвара"-Цьер, загадвае сваім генэралам адабраць гарматы ў нацыянальнай гвардзіі. Ледзь золак 18 сакавіка, 3000 чалавек пад камандай генэралаў Леконта і іншых, ціха прабраліся на Монмартр і на хвіліну захапілі гарматы. Але каравул пасьпеў узьняць шум, жанчыны, якія ў гэты раньні час хадзілі ўжо заняць сваё месца ў чарзе за малаком, пабеглі будзіць сваіх мужыкоў. Узьняўся страшэнны лямант. Гэтыя тры тысячы ўрадавых войск апынуліся ў палоне ўзрушанага натоўпу. Мужчыны, жанчыны і дзеці—усе ўзялі ўдзел у абароне заваёў нацыянальнай гвардзіі.

Гарматы былі адваяваны назад, а разам з тым парыскі пролетарыят перамог у гэтую раніцу буржуазію, якая пасьпешна ўцякала ў Вэрсаль, каб адтуль рыхтаваць крывавую лазьню Парыжу—гэтаму гораду бунтароў.

Яшчэ да гэтага гістарычнага дню,—5 сакавіка мы чытаем, у пачаўшай зноў выходзіць газэце бунтароў—Пер-Дзюшэн, наступны характарны па сіле вобразнага пераконаньня артыкул:

„Цярпець галадоўку, праліваць сваю кроў, выпіць да дна свой сорам, усяго гэтага мала: нам трэба яшчэ заплаціць за тры кватэрных тэрміны. Ужо больш шасьці месяцаў мы нічога не вырабляем, не прадаём.

Чым-жа мы заплацім за гэтыя тры тэрміны?

Мы ня будзем плаціць за іх.

Дарэмны ўсе патугі біржавікоў; дарэмна судовыя приставы будуць працаваць і ўдзень і ўночы, дарэмна трыбуналы прыслужываюць ад досьвітку да ночы, дарэмна вайсковыя суды выносяць свае страшныя прысуды, дарэмна брэтонцы Трашу і салдаты Шанаі набываюць свае стрэльбы.

Мы не заплацім...

З сьцяны ня выціснуць масла; з пустых касаў зруйнаванай Францыі ня выцягнуць чатырох мільярдаў кватэрнай платы, якімі штогод узбагачаюцца дармаеды капіталу.

Мы не заплацім...

Нават шпіёны Цьера, якія затаіліся ў Парыжы, нават корэспондэнты рэакцыйных газэт вымушаны былі адзначыць, што паўстаньне 18 сакавіка было сапраўды паўстаньнем усяго працоўнага Парыжу, супроць здрадніцкай буржуазіі.

Вось дваццаць восьмае сакавіка. Дзесяты дзень перамогі. Парыж паслаў сваіх дэлегатаў у Комуну.

Бязупынным струменем рухаюцца батальёны з музыкай наперадзе. За імі ідуць члены комуны, якіх выбіральшчыкі пад барабанны грукат адпраўляюць у Ратушы на першае паседжаньне Комуны.

Вось Монмартцкія батальёны. Барабаны б'юць паход. Уперадзе ідуць пяць чалавек, ствараючы адну шарэнгу: пяць членаў комуны, абраных 18 акругай.

У натоўпе чуваць:

— Падымі хлапчука майго ўверх, няхай і ён таксама пабачыць. Гэткія дні павінны адбіцца ў памяці на ўсё жыцьцё.

І сапраўды.

Вуліца Рыволі, колькі хапае вока, поўная мундзіраў, сьцягаў. Музыка грыміць адусюль. Дзесяць, дваццаць, сто батальёнаў праходзяць, уліваючыся ў шматкаляровае мора сьцягаў, якія бурліва нясуцца па плошчы Ратушы.

Як радасна грыміць музыка. А гэтыя, шырока разьвёненыя іргы, якія крычаць марсэльезу... Гэтыя чырвоныя сьцягі з залатою махрай, гэтыя кукарды з чырвоных істужак на штыках, падобныя пучкам чырвоных кветак.

Перад ратушай, на трыбуне, пакрытай чырвоным драпаваньнем, вакол вялікага стала засядаюць члены Цэнтральнага камітэту нацыянальнай гвардыі ў чырвоных шалях з срэбнай махрай.

Тротуары перапоўнены народам.

А яшчэ-ж учора на вуліцы Перамогі былі барыкады, гарматы, і вартавыя падазрона аглядалі грамадзян.

Сёньня ўсё зьмянілася.

Зьнік ранейшы ваяўнічы выгляд. Ня відаць больш барыкад, каравулаў. На дахах поўна людзей. Хлапчукі абляпілі карнізы.

Сонца асьвятляе, надае вялізарнае відовішча.

Яно пераліваецца на штыках і на залатых або срэбных галунах афіцэраў, залівае хвалямі асьляпляючага сьвятла сьцягі ўсіх батальёнаў.

Натоўп крычыць, пяе, раве, бурліць. Што ён пяе?

Марсэльезу...

Што ён крычыць?


Няхай жыве комуна!..

Калі Цэнтральны камітэт абвясьціў імёны абраных у комуну, калі гарматны залп раптам узрушыў увесь горад, з тысяч грудзей пачуўся крык, які славіў рэспубліку і комуну, крык поўны гэткага энтузіязму, гэткага аднадушша і рашучасьці,

што яго не забудзе ніхто з прысутных на гэтым сьвеце, хоць-бы яму прышлося жыць стагодзьдзі.

Сто тысяч стрэльбаў падняліся над сотняй тысяч галоў. Людзі на плошчы кляліся перамагчы або памерці"...


Але перамагчы было вельмі цяжка. Парыская Комуна ня мела самага галоўнага, што гэтак патрэбна для канчатковай перамогі. Ня было належнай партыі, цэмантуючай волі, якая-бы злучыла ў адно, групавала і цэмантавала сотні тысяч працоўных, гатовых памерці за жыцьцё комуны.



Адступленьне арміі Комуны на мосьце Аньера.

Комуна, якая жыла і працавала пад грукат артылерыйскай страляніны, усё-ж зрабіла багата для парыскага пролетарыяту. Комуна забясьпечыла пэнсыяй кожнага свайго гвардзейца і яго сям'ю. Яна спыніла продаж рэчаў закладзеных у лёмбардзе. Старую армію яна замяніла міліцыяй, да якой павінны належаць усе грамадзяне, здольныя насіць зброю. Комуна аддзяліла царкву ад дзяржавы, нацыяналізавала маемасьць духавенства. Фабрыкі і заводы, пакінутыя буржуазіяй, комуна перадала рабочым організацыям. Комуна пачала працаваць над тым, каб зрабіць асьвету даступнай для шырокіх масаў, каб сам рабочы і селянін атрымаў тую самую адукацыю, як і багацей, і пры тым дармова, бо „навука ня менш патрэбна для жыцьця, чым вока для зроку".

Рэволюцыйны рух пачаў распаўсюджвацца за межамі Парыжу. У розных гарадох: Марсэлі, Ліёне, Тулузе організоўваюцца комуны, якія праз некаторы час прыдушваюцца ўрадавым войскам.



Барыкада на пляцы Клішы

Маўчыць адарваная ад Парыжу вёска. Урад, як мага, абклаў блёкадай Парыж, каб адтуль аніводнага слова праўды не даходзіла ў францускія провінцыі. Дзесяткамі тысяч экзэмпляраў распаўсюджвае з Вэрсалю ўрад хлусьлівыя праклямацыі аб тым, што бандыты апанавалі Парыж, што бандыты-комунары б'юць і рэжуць там людзей.

Комуна з гэтае прычыны зьвяртаецца да сялян Францыі з адозвай: якая завецца: „Маніфэст да вясковых рабочых".

„Брат, цябе ашукаюць. Нашы інтарэсы адны і тыя-ж. Тое, чаго патрабую я, хочаш і ты: вызваленьня, якога я дамагаюся,—гэта тваё вызваленьне. Табе таксама, як і мне, не стае свабоды, адпачынку, разумовага і духоўнага жыцьця. Ты і я—мы ўсе яшчэ нявольнікі жабрацтва...

Вось ты стары, ты ўвесь час працаваў, аднак, ты не багаты і ў цябе на старасьці год няма нават кавалку хлеба. Уся твая ашчаднасьць пайшла на выхаваньне дзяцей, якіх у цябе забірае рэкруцкі набор ці якія, ажаніўшыся, у сваю чаргу, будучы жанатымі, будуць клапаціцца, каб прахарчаваць цябе. Апусьціўшы голаву, пойдзеш ты ад дзьвярэй да дзьвярэй жабраваць, што цябе так зьневажае. Гэта несправядліва, брат селянін, хіба ты не разумееш гэтага? Калі-б праўдзіва было тое, што ўласнасьць вынік працы, ты быў-бы ўласьнікам: ты-ж столькі працаваў! Ты валодаў-бы тэй маленькай карткай з садам і з гародам, якія зьяўляліся тваей марай, запалам тваіго жыцьця, але ты ня змог набыць гэта.

Гэта несправядліва! Вось чаму Парыж паўстае, протэстуе і патрабуе зьмены законаў, якія даюць у рукі багатых усю ўладу над працоўнымі.

... Парыж хоча зямлі—для сялян, сродкі вытворчасьці—для рабочых, работы—для ўсіх

Плады зямлі тым, хто яе абрабляе.

Няхай ня будзе больш ні надта багатых, ні надта бедных.

Няхай ня будзе большні работы без адпачынку, ні адпачынку без работы.

Гэта—мажліва! Для гэтага патрэбны толькі добрыя законы, якія і зьявяцца тады, калі працоўныя не захочуць больш, каб гультаі ашуквалі іх.

Вам ясна цяпер, што справа Парыжу — ваша справа. Калі Парыж падзе, ярмо жабрацтва застанецца на вашай шыі, яна ў спадчыну застанецца вашым дзецям.

Дапамажэце Парыжу атрымаць перамогу і, што-б ні здарылася, добра запомніце гэтыя словы, бо рэволюцыі будуць адбывацца да таго часу, пакуль ня будуць здабыты:

Зямля—сялянам

Заводы—рабочым.

Работы—ўсім.

І „што-б ні здарылася"— і хоць парыская камуна была на час прыдушана, яна зноў адрадзілася ў 1917 годзе пад тым-жа самым загортаваным у змаганьні чырвоным сьцягом на другой зямлі і другой дзяржаве для таго, каб пад кіраўніцтвам вялікага Леніна стварыць вольны Саюз Савецкіх Соцыялістычных Рэспублік.

ЦЬВІК

Ён помніць—
Калісьці ў далёкія годы
Яго на вялікі завод прывязьлі.
І... разам з машынамі ў гэтым заводзе
Ён бачыў магутнае працы разьліў.
І кожную хвілю магутнае цела
Давіла на цьвёрдае цела цьвіка.
І ў працы машыны ўпэўнена, сьмела
Ён стрымліваў колаў жывы перакат.
І можа таму, што ён чуў сваю сілу
У рокаце, грозных і гордых станкоў,
У працы разгоннай —
Заводу машынам
Сваю нявыказную нёс ён любоў.
Ён помніць той час—
Пустыром, карпусамі
Ішлі туманы і брадзіла імгла...
Тады пазнаёмілася з цьвікамі
І з ім пазнаёміла іржа.
І ён сумазаў па разгоне вялікім,
Па працы разгоннай і песьнях машын,
Станкох, дзе быльнёг і самотны і дзікі
Жалезнае цела заводу глушыў.
Як новыя дні у разгоне нясьпынным
І зноў аднавілі магутны завод,
Ён бачыў у новым уздыме машыны
І стружкі і іскры жалезных парод.

Пад вуліцы шумы,
Пад лязгат трамваю,
Пад говар машыны
Ён людзям казаў:
„Я ледзьве трымаю,
Я ледзьве трываю,
Мяне загубіла іржа."
„Я працы жадаю, таварышы людзі,
Ды толькі хвароба зламала мяне".
А людзі пачуюць,
І людзі забудуць,
І кожны няўважліва цьвік абміне.
Бяз зьмены за працаю дні прабягалі.
Аднойчы машыне сьпявалі пасы:
„Рыхтуйся, сяго́ньня прыходзяць брыгады
Завод аглядаць, аглядаць карпусы".
І людзі прышлі да яго...
і прысталі.
З іх кожны памацаў
І кожны сказаў:
„Ён ледзьве трывае,
Ён ледзьве трымае
Яго загубіла іржа".
І ў домне вялікай,
І ў домне высокай
Куды высыпалі нарэшце цьвікі,
Ён жыў невялічкаю кропляю сока
У целе пякучай жалезнай крыві.

А. Куляшоў

Поэзія

НАЦЫЯНАЛ-ДЭМАКРАТАМ

Мы—
кляса перамог,
і творчы
свой уздым
пад бураю эпох
загартавалі
мы.
Гісторыя
за нас!..
А вы?!..
што варты вы?!..

Ля нашага стырна
надзейны стырнавы.
Ён—рабочай клясы сын,
у ім—
мільёны сіл,
Мільёны
моцных рук,
яго—
магутны рух.
Зямлю
старых руін
прыгнёту
і маны
Сягоньня
робім мы
Краінаю машын.
І
побытаў сівых
больш
не патрэбна нам.

Тут—
бацькаўшчына ўсіх,
хто
век працуе сам.
Зямлю,
дзе смутак жыў,
мы
змусілі ажыць.
Балотных
нетраў скарб
мы
змусілі паўстаць,
прымусілі зарэць
балотных
нетраў скарб,
а сілу
вольных рэк
пакорна працаваць.
Стары
паганскі міт
мы
выкінулі ў хлам,
ні пан,
і не найміт
яго
ня верне нам.
Таму,
каб разарваць
строй
нашых перамог,—
узброілася „рАць“
на
сьметніку эпох.
І што пра іх сказаць?—
Імкнуліся
яны
Краіну
адагнаць
на
рэйкі Скарыны.

Магільных
спраў найміт
хацеў
у буры дзён



Тодар Кляшторны.

крывёю затапіць
здабытае жыцьцём.
Крывавай
помсты гру
ён
зноўку рыхтаваў,
ён
творчасьць
нашых рук
авансам прадаваў.

За гэты вось
аванс,
за справу
вашых дзей
Мы
(міліёны нас)
вам
скажам
кожны дзень:
— Ну, так,
панове,
так,
за нацыю вы...
што-ж!?..
А хто
нібы жабрак
Вільгельму клянчыў,
хто?!..

А хто,
скажэце нам,
у краме
чорных спраў
фашыстым
і панам
краіну прадаваў?
Брыда!..
Ідзеце вон
магільных
спраў майстры,
ня вам
рашаць таго,
што
вырашылі мы!..

Вы
несьлі нам штыхі,
гарматных
громаў гру.
У вас
і папа Пій
напэўна Беларус?..
Ён
так-жа супроць нас
заўжды
паслаць гатоў
прадажнага Хрыста—
страшылішча вякоў.
Ды
ўсіх такіх
сьвятых
Мы
выкінулі ў хлам.
Тут—
бацькаўшчына ўсіх,
хто
век працуе сам.
Гісторыя
за нас!..
А вы?!..
нікчэмнасьць тут!..
Мы
(міліёны нас)
падпішам вам прысуд.

Менск.
8 сьнежня 1930 г.

Расьце і мацнее Савецкі Саюз—бацькаўшчына пролетарыяту

Кніжная вітрына

Міх. Шмідт.—Авангарду быць у аванг рдзе сяўбы. БДВ. Менск. 1931 г. 34 стар. Цана 10 кап.

Пасьпяховае правядзеньне другой бальшавіцкай веснавой сельскагаспадарчай кампаніі гэтага году з сапраўдным рэвалюцыйным запалам, на падставе творчага ўздыму працоўных мас рашучага наступленьня на кулака і ліквідацыі яго як клясы на базе суцэльнай колектывізацыі,—справа выключнай палітычнай важнасьці. Таму ўся работа вясковых партыйных і комсамольскіх ячэек павінна быць падпарадкавагагэтай асноўнай задачы.

Аўтар брошуры вызначае асноўныя задачы парторганізацый вёскі ў часе другой бальшавіцкай вясны, навокал якіх павінны быць мобілізаваны колгасныя і бядняцка-серадняцкія масы.

Зьмешчана тут і пастанова ЦК КП(б)Б аб падрыхтоўцы да веснавой пасеўнай кампаніі 1931 г.

„На фронце колектывізацыі“—зборнік артыкулаў. БДВ. Менск. 1931 г. 56 стар. Цана 10 кап.

Гэта кніжка зьяўляецца зборнікам артыкулаў, якія папярэдне друкаваліся ў расійскіх кругабежных выданьнях. Тут зьмешчаны: „Новы прыліў у колгасы і клясавае змаганьне“—Д. Лур'е, „Мацней пролетарскае кіраўніцтва колектывізацыяй“—перадавая „Праўды“, „Саўгасы на змаганьне за новы ўздым колгаснага руху“—Міх. Набокаў і „Тактыка шкоднікаў у пытаньнях колектывізацыі“ Я. Нікуліхіна.

Артыкулы брошуры падкрэсьліваюць неабходнасьць актыўнага пролетарскага кіраўніцтва справай колектывізацыі, падкрэсьліваюць вострасьць клясавага змаганьня, якое няўнікнёна суправаджае процэс перабудовы сельскай гаспадаркі на соцыялістычны лад.

Апошні артыкул Нікуліхіна ўскрывае шкодніцкую тактыку Кандрацьцеўцаў у пытаньнях будаўніцтва саўгасаў і колектывізацыі.

Т. Левігаў—Сельсавет тварам да колгасаў. БДВ. Менск. 1931 г. 98 стар. Цана 17 кап.

Ва ўмовах новага п рыоду, ва ўмовах суцэльнай колектывізацыі вёскі і ліквідацыі кулацтва як клясы, роля сельскіх саветаў нязьмерна ўзрастае.

Перад нізавымі органамі пролетарскай дыктатуры ў вёсцы пастаўлены вялізарныя задачы. Сельсаветы павінны зьявіцца сапраўднымі штабамі соцыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі іісьці на чале гэтай перабудовы. Яны павінны быць рашуча павернуты тварам да колгасаў.

У гэтай брошуры досыць шырока аўтар спыняецца на наступных пытаньнях: сельсавет—організатар колгаснага руху, клясавае змаганьне ў вёсцы, практыка работы сельсавета ў галіне колектывізацыі і чарговыя задачы сельсаветаў.

Кніжка прынясе карысьць нізавым работнікам, пазнаёміўшы іх з асноўнымі задачамі сельсаветаў на новым этапе.

Язэп Падрэцкі—Колектывізацыя і работа з беднатой. БДВ. Менск. 1931 г. 54 стар. Цана 12 кап.

Комуністычная партыя заўсёды надавала і надае вялікую ўвагу організацыі батрацтва і беднаты вёскі. Праз організаваную работу з батрацтвам і беднатой вёскі мы ўмацоўваем блёк батрацтва і беднаты з серадняком супроць кулака, умацоўваем дыктатуру пролетарыяту, умацоўваем саюз рабочае клясы з асноўнымі масамі сялянства вёскі.

Кніжачка Падрэцкага якраз прысьвечана задачам і формам работы з беднатой. На грунце пастановы ЦК КП(б)Б „аб становішчы работы сярод беднаты і далейшых задачах“ аўтар дае шэраг конкрэтных парад, якія дапамогуць нізавому работніку ў стварэньні і кіраваньні групамі беднаты.

Ю. У. Стрэле—Колгасы БССР да зьезду. БДВ. Менск. 1931 г. 70 стар. Цана 20 кап.

Брошура т. Стрэле знаёміць чытача са станам колгаснага будаўніцтва ў БССР. У шэрагу разьдзелаў аўтар паказвае дынаміку колгаснага будаўніцтва, гаворыць аб асноўных выніках першага году масавай колектыўнай працы. Не забыта організацыя працы і пытаньне аб колгасных кадрах.


У канцы брошуры аўтар дае пляны: засеўных плошчаў, організацыі спэцыялізаваных жывёлагадоўчых і сьвінагадоўчых колгасаў і сіласаваньня на 1931 г.

Брошура зьяўляецца добрым даведчыкам колгаснага руху.

Н. Дарожкін — Хваробы збожжа. БДВ. Менск. 1931 г. 104 стар. Цана 90 кап.

Мінімальныя страты ад хвароб расьлін сельскае гаспадаркі СССР можна лічыць сотнямі мільёнаў рублёў. Таму на вывучэньне хвароб і спосабаў змаганьня з імі павінна быць зьвернута самая сур'ёзная ўвага.

Кніжка Дарожкіна дае асноўныя весткі аб хваробах пшаніцы, жыта, ячменю, аўса, проча і кукурузы і паказвае спосабы змаганьня з імі.



Аўтар расказвае аб галаўні, іржы, ражкох, мучністай расе, сьнежнай плесьні, „п'яным хлебе“, плямістасьці лісьцяў, чорнай плесьні ды інш.

У канцы кніжкі даданы табліцы фунгісыдаў ды іх прыгатаваньня. Ня гледзячы на цяжкасьці мовы гэта кніжка можа быць выкарыстана ня толькі аграномам. Яна прынясе некаторую карысьць і колгасьнікам.

Выданьне Беларускага Дзярж. Выдавецтва. Адказны рэдактар МІХАСЬ ЧАРОТ.

АДКРЫТА ПАДПІСКА НА 1931

НА ШТОМЕСЯЧНУЮ БЕЛАРУСКУЮ ЧАСОПІСЬ ЛІТАРАТУРЫ, ПОЛІТЫКІ, ЭКОНОМІКІ, ГІСТОРЫІ, КРЫТЫКІ

„П О Л Ы М Я“

ПАД РЭДАКЦЫЯЙ: А. СЯНЬКЕВІЧА, П. ГАЛАВАЧА, А. НЕКРАШЭВІЧА, Р. МУРАШКІ, С. РЫЧКОВА.

Х-ты ГОД ВЫДАНЬНЯ

ЧАСОПІСЬ „ПОЛЫМЯ“ ВЫХОДЗІЦЬ ШТОМЕСЯЦ, 12 КНІЖАК НА ГОД, памерам кожная ў 10—12 аркушоў. ПАДПІСЧЫКІ, якія ўнясуць пры падпісцы поўнасьцю 10 рублёў, атрымаюць у 1931 г. ДАРМОВЫ ДАДАТАК — літаратурна-мастацкую часопісь „УЗВЫШША“ за 1927 або 1928 год, па жаданьню.

НА ВЫПЛАТУ МОЖНА ПАДПІСАЦЦА:

ГАДАВЫМ ПАДПІСЧЫКАМ у 3 тэрміны: пры падпісцы—4 р. 50 к., да 1-га красавіка—3 руб. і да 1-га ліпеня—2 руб. 50 кап.

ПОЎГАДАВЫМ ПАДПІСЧЫКАМ у 2 тэрміны: пры падпісцы—3 руб. 50 кап. і да 1-га красавіка—1 руб. 50 кап.

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

на 12 мес. 10 руб.
„ 6 „ 5 „ 50 к.
„ 3 „ 3 „

КОШТ АСОБНАГА НУМАРУ 1 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА: У аддзеле падпісных і пэрыядычных выданьняў БДВ (Менск, Савецкая, 79, тэл. 17-12); Цэнтральнай Кнігарняй Белдзяржвыдавецтва (Менск, рог Ленінскай і Савецкай); усімі гарадзкімі аддзяленьнямі Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва; аддзелам падпіскі пэрыядсэктару ГІЗ'у РСФСР (Менск, Савецкая, 54); усімі паштова-тэлеграфнымі і ўсімі кніжнымі крамамі спажывецкіх таварыстваў БЕЛКООПСАЮЗУ.

Цана 15 кап.



АДДЗЕЛ ПАДПІСНЫХ І ПЭРЫОДЫЧНЫХ ВЫДАНЬНЯЎ

ПАДПІШЫСЯ на 1931

на адзіны ў БССР ілюстраваны двухтыднёвы часопіс тыпу лепшых ілюстраваных часопісаў СССР

Чырвоная Беларусь

ПАД РЭДАКЦЫЯЙ МІХАСЯ ЧАРОТА

У „Чырвонай Беларусі" на працягу 1931 г. будуць зьмешчаны:

Апавяданьні: Авалава, З. Бядулі, С. Баранавых, Іл. Барашкі, Вольнага, Тараса Гушчы, Цішкі Гартнага, Платона Галавача, Даўгапольскага, Міхася Зарэцкага, Ізбаха, Васіля Каваля, Элі Кагана, Р. Кальтофэн, М. Кальтофэн, М. Лынькова, Ліманоўскага, Р. Мурашкі, Маўра, М. Нікановіча, Нёманскага, Кузьмы Чорнага, Міхася Чарота і інш.

Поэмы і вершы: А. Александровіча, Астапенкі, Янкі Бобрыка, П. Броўкі, М. Багуна, Алеся Звонака, Янкі Купалы, Якуба Коласа, Крапівы, Максіма Лужаніна, Валерыя Маракова, І. Плаўніка, Юлія Таўбіна, Ізі Харыка, Ул. Хадыкі, М. Хведаровіча, Міхася Чарота, С. Шушкевіча і інш.

Нарысы і фэльетоны: Бяліны-Падгаецкага, Бэндэ, Вольнага, Яўгена Жука, Цімоха Зарэчнага, Клімчука, Мікуліча, Васіля Сташэўскага, Шкадарэвіча, Хв. Шынклера.

Малюнкі і фото: Ахрэмчыка, Азгура, Бразэра, Булычова, Вал. Волкава, Давідовіча, Кіпніса, Барыса Малкіна, Мазэлева, Ул. Семяякі, Салавейчыка, М. Філіповіча і цэлага шэрагу раённых корэспондэнтаў.

УСЯГО „ЧЫРВОНАЯ БЕЛАРУСЬ" ДАЕ Ў ГОД:

звыш 1000 фотоздымкаў, якія ілюструюць соцыялістычнае будаўніцтва СССР і БССР, а таксама замежнае жыцьцё, звыш 300 малюнкаў лепшых мастакоў, звыш 200 апавяданьняў, вершаў і нарысаў.

„Чырвоная Беларусь" будзе высьвятляць:

самыя шырокія праявы жыцьця, рэконструкцыйнага пэрыоду і магутнага наступу па ўсяму фронту вёскі, соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, змаганьне за пяцігодку ў чатыры гады, колектывізацыю сельскай гаспадаркі і інш.

Умовы падпіскі:


На 1 год		На 6 мес.		На 3 мес.	
р.	к.	р.	к.	р.	к.
3	—	1	50	—	75

Асобны нумар каштуе **15 к.**

Падпіска прымаецца: Аддзелам падпісных і пэрыодычных выданьняў БДВ, Менск, Савецкая, 79; усімі кнігарнямі, кіёскамі і ўпаўнаважанымі БДВ, усімі пашт.-тэлеграфнымі канторамі і крамамі спажыв. коопэрацыі.

Тэлефон рэдакцыі 17-09

Друкарня імя Сталіна Зак. № 918—9.000 экз. Галоўлітбел № 1031


B000000207380 1